# МЫ ЖАДАЕМ ШЧАСЦЯ ВАМ!



Таццяну Станіславаўну Бубенька ведаюць далёка за межамі нашага ўніверсітэта, горада, краіны. Яна прафесійны гісторык, руплівы археолаг, аўтар шматлікіх кніг, выдатны педагог, цікавы суразмоўца і проста прыязны чалавек. Яе паважаюць калегі і любяць студэнты, да Таццяны Станіславаўны нярэдка звяртаюцца па дапамогу і параду.

Штогод Таццяна Бубенька разам з хлопцамі і дзяўчатамі едзе на археалагічную практыку, дзе перадае ім свой вопыт, заахвочвае іх да вывучэння гістарычнай спадчыны роднага краю. У выніку многія практыканты, якія ездзілі з ёй на раскопкі, на наступны год імкнуцца патрапіць туды ў якасці валанцёраў.

А як захапляльна выкладчык чытае лекцыі, як цікава праводзіць практычныя заняткі! Можна смела сцвярджаць, што Т.С. Бубенька – легенда гістарычнага факультэта.

Паважаная Таццяна Станіславаўна! Калектыў факультэта сардэчна віншуе Вас з юбілейным Днём нараджэння! Зычым Вам моцнага здароўя, дабрабыту, унікальных знаходак, навуковых адкрыццяў, удзячных студэнтаў, радасці і шчасця ў жыцці.